## Жанравая спецыфіка паэмы (пастаноўка пытання)

Паэма — жанр «сінтэтычны», у якім спалучаюцца і ўзаемадзейнічаюць адзнакі ўсіх літаратурных родаў, у першую чаргу — лірыкі і эпасу (гаворка не ідзе пра асобную жанравую разнавіднасць — драматычную паэму). Гістарычна погляды на родавую прыналежнасць паэмы мяняліся. Так, Гегель лічыў паэму жанрам эпасу, але заўважаў, што толькі гамераўскія «Іліяда» і «Адысея» з'яўляюцца «эпапеямі ва ўласным сэнсе слова». Створаныя ў пазнейшыя эпохі паэмы страчваюць сваю родавую «чысціню», бо адчуваюць вялікі ўплыў лірыкі. Яго